ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 04 2017 г.

SEX-БАЛЯСЫ

У ЧЫМ ЯНО, ШЧАСЦЕ?

На вочы патрапіла даследаванне вучоных па адным філасофскім пытанні, можна сказаць, самым галоўным для нас. («Ты можаш бясконца радавацца лету, толькі які ў гэтым толк, калі ў цябе работа».) Незалежныя даследчыкі арганізацый ААН апублікавалі абноўлены рэйтынг самых шчаслівых краін свету. У дакладзе змяшчаюцца звесткі аб 156 краінах. У якасці паказчыкаў спецыялісты ў розных сферах выкарыстоўваюць даныя аб узроўні дабрабыту, працягласці жыцця, сацыяльнай абароненасці і іншыя характарыстыкі. («Здымаў з карткі зарплату. Банкамат выдаў нейкія дзіўныя гукі. Думаю, рагатаў».)

Беларусь заняла ў гэтым рэйтынгу 67-е месца. Не самы горшы вынік. («Шукаеш шчасця, а набываеш вопыт. Часам думаеш — вось яно, шчасце! А не, зноў вопыт».) Даследчыкі, безумоўна, людзі разумныя, зноў жа — навуковыя методыкі... Але ж і чалавек, як вядома, істота недасканалая. («Бывае, збіраеш, збіраеш на «Ламбарджыні» і айфон, а потым — бац! Не стрымалася і купіла бляшу на прыпынку!») І шчасце — яно ў кожнага сваё, часам незалежнае ад знешніх фактараў. («Я спецыяльна нарадзіўся летам, каб на дзень нараджэння ў мяне замест торта быў шашлык».)

Чыталі навіну пра тое, як расіянка Любоў Талкаліна, былая жонка Ягора Канчалоўскага, на адпачынку ў індыйскім Гаа знялася на пляжы аголенай? Цела 39-гадовай актрысы прыкрывае толькі невялікі кавалак тканіны кшталту шаліка ці парэа. «Венера сарамлівая» — так назвала той здымак Талкаліна. І тут, як яно часта бывае, панеслася на прасторах інтэрнэту... («Усе замерлі ў чаканні той самай смелай бабы, што першая выйдзе на вуліцу без калготак і павядзе за сабой астатніх».) А што ўласна адбылося? Ніхто, мабыць, асабліва не звярнуў увагі на словы самой актрысы: «...Не ведаю на свеце ні аднаго іншага месца, дзе хацелася б так. Проста дзеля прыгажосці ў прыгажосці. Хто бываў у гэтых мясцінах, той ведае і зразумее...» Ну, шчаслівы быў чалавек у нейкі момант свайго жыцця: ад заняткаў ёгай, краявідаў, прыгожага ўласнага цела, ад таго, што нарэшце публічна заявіла аб расставанні з мужам! Дык чаму б не? («Калі ў жанчыны іскрынкі ў вачах, значыць, яе тараканы ў галаве нешта адзначаюць...»)

А гісторыя з гумарыстам Яфімам Шыфрыным, які выклаў у сеціве здымак падчас баўлення часу ў ложку з незнаёмкай? Сам артыст суправадзіў фота доўгім пастом на тэму ўзросту і страсці. Паводле яго слоў, ён знаходзіцца ў самым росквіце сіл. («Як казаў мой дзед: я — твой дзед!») Усе ведаюць пра захапленне Шыфрына фізічнымі практыкаваннямі і яго выдатную форму. Малайчына, што тут скажаш! Адзінае, што ў гісторыі з гэтым фота назіраўся невялікі перабор з самалюбаваннем. («У спартзале: «— Прабачце, а вам яшчэ доўга перад люстэркам фатаграфавацца? — Яшчэ адзін падыход. — Тады я пачакаю».)

Не сакрэт, што для некага шчасце — гэта грошы. Каб выйграць, ды шмат! Знаёмыя на поўным сур'ёзе пры дапамозе латарэі спрабавалі абзавесціся кватэрай. Марна, фартуна не кожнаму ўсміхаецца. (Памятаеце, з фільма «Масква слязам не верыць»: «— Вось я, напрыклад, заўсёды латарэйныя білеты набываю. — Выйграла? — А як жа! Два разы па рублю!») Ды і нават вялікія грошы далёка не кожнаму могуць дапамагчы. Чыталі, як жыхарка Шатландыі, што выйграла ў 17 гадоў у латарэю мільён фунтаў стэрлінгаў, абвінаваціла праз чатыры гады яе арганізатараў? Заявіла, што грошы сапсавалі ёй жыццё, маўляў, не трэба было атрымліваць іх да паўналецця. Шатландка сказала, што за час багацця ёй вельмі надакучыла адзенне ад вядомых брэндаў і адпачынак на дарагіх курортах... Як гаварыў пра іншага персанажа кот Матроскін: «Сродкі ў нас ёсць. У нас розуму не хапае».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

А многія атрымліваюць задавальненне, калі грошы трацяць. («— Люся, як ты магла зрасходаваць за адзін раз усю зарплату? — Пайшлі, пакажу!») Як адна кітаянка, якая наняла 900 таксі на дзве гадзіны, каб зрабіць прапанову любаму. Аўтамабілі ёй спатрэбіліся з-за ўстаноўленых на дахах легкавушак электронных табло. На іх па просьбе дзяўчыны ўвесь заказаны час высвечвалася фраза: «Я хачу выйсці за цябе замуж, ты адважышся жаніцца на мне?» За паслугу кітаянка заплаціла каля 1,5 тысячы долараў, але, паводле яе слоў, аб патрачаных грошах нікольки не шкадуе: любы прыняў яе прапанову! («У 7 гадоў я думала, што дарослая... У 14 думала, што я страшная... У 19 усё-такі вырашыла, што прыгожая... У 25 думала, што дурніца... А цяпер я разумею, што я дарослая, страшэнна прыгожая і далёка не дурніца...») У мяне адносна гэтай гісторыі толькі адно пытанне: чаму хлопец аж дзве гадзіны той надпіс чытаў? Усё ж зразумела было адразу — трэба браць! Ну сапраўды ж, не ў грошах шчасце, так? («Калі я бачу дзяўчыну ў ірваных джынсах — разумею, добрая гаспадыня, прыстойная жанчына, умее на сабе эканоміць. Такая футра гадоў 15 будзе насіць».)

Ісландскія СМІ паведамілі, што ў краіне зафіксаваны ўсплёск нараджальнасці праз дзевяць месяцаў пасля Еўра-2016. Ісландыя тады атрымала перамогу над зборнай Англіі, што стала найвышэйшым дасягненнем у гісторыі мясцовага футбола. Радасць і шчасце з гэтай нагоды ахапілі жыхароў вострава...

...Як гаварыла Варона ў мульціку пра дамавічка Кузю: «Шчасце — гэта калі ў цябе ўсе дома». Лепш, мабыць, і не скажаш. І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Шчасце — у нас.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Калі выступаеш за краіну, гэта ідзе ад сэрца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Якая краіна найбольш запомнілася?

— Шмат гуляў у Еўропе, жыццё там у асноўным падобнае, а вось сёлетні сезон, як ужо казаў, пачынаў у Катары. Здавалася часам, што знаходжуся ў іншым свеце. На вуліцах у любы час сутак вельмі мала людзей, усе ў асноўным ездзяць на вельмі дарагіх машынах. Мясцовыя не працуюць, такое адчуванне, што грошы з'яўляюцца ў іх з нараджэння. Таму ўвесь дзень яны могуць проста пракатацца на машыне. У крамах, рэстаранах працуюць выключна прыезджыя — выхадцы з Пакістана, Інданезіі, Шры-Ланкі, краін Афрыкі.

Катарскі клімат прыйшоўся крыху не па мне — пастаянная спякота. Прыроды як такой няма, уся зеляніна пасаджана ў пясок. Хоць ёсць і ў Катара адзін вялікі плюс — Персідскі заліў, ён неймаверна прыгожы, вада мае блакітны колер, а яе тэмпература каля 35 градусаў.

«Мару схадзіць на рыбалку, у грыбы, ужо нават не памятаю, калі апошні раз выбіраўся ў лес».

— У Казахстане, напэўна, сутыкнуўся зусім з іншым кліматам?

— Так, вось там было нерэальна шмат снегу і вельмі холадна. Памятаю, неяк ехалі па трасе і снегу было столькі, што здавалася, быццам едзем у тунэлі, па баках якога пяціметровыя гурбы.

Уразіў клімат у Аўстрыі. Я жыў каля падножжа гор, надвор'е змянялася так кардынальна, што ўвечары на дварэ магло быць +15, а раніцай на зямлі я бачыў пласт снегу сантыметраў 40.

— Вернемся да Катара. Узровень развіцця спорту моцна адрозніваецца ад беларускага?

— Там шмат грошай укладваецца цяпер у гэтую сферу, але ствараецца ўсё неяк штучна, запрашаюць шмат замежнікаў ва ўсе віды спорту. Адносіны да нас, легіянераў, і мясцовых, вядома, розныя. Катарцы могуць спазняцца на трэніроўку, размаўляць па тэлефоне падчас прагляду відэа матчаў. У самы разгар трэніроўкі некалькі мясцовых гульцоў спакойна могуць адысці ў куток на малітву. Гэта здавалася мне дзіўным, асабліва напачатку. Але і яны не разумелі нешта ўва мне. Напрыклад, для нас звыкла хадзіць у саўну, каб лепш аднаўляцца пасля цяжкіх гульняў і трэніровак, а яны заходзяць туды раз у месяц на 5 хвілін. На мяне там глядзелі як на ненармальнага, маўляў, нешта ён усё ў саўну ходзіць праз 3-4 дні, парыцца, сядзіць там, выходзіць чырвоны. А я прыходзіў, ставіў сабе тэмпературу на 95 градусаў і адчуваў, што Беларусь дзесьці блізка *(смяецца)*.

— За гэтыя дзесяць гадоў дзе падабалася гуляць больш за ўсё?

— Вельмі камфортна было ў Аўстрыі, гэта развітая краіна, зручная для жыцця. Плюс там я мог гуляць у валейбол на нядрэнным узроўні. Самая высокая якасць гульні была ў Турцыі, там выступаюць адны з найлепшых легіянераў, напружаныя гульні, добры чэмпіянат. Атрымаў задавальненне ад працы ў гэтай краіне, але не атрымаў грошай, запазычанасць да гэтага часу не выплачана і складае сур'ёзную суму, яе хапіла б, напэўна, на палову аднапакаёвай кватэры ў Мінску.

— Як хутка зразумеў, што валейбол — гэта справа твайго жыцця?

— Я рос у спартыўнай сям'і: і мама, і тата — майстры спорту па фехтаванні. Бацька да гэтага часу ў справе — цяпер працуе ў інваспорце, трэніруе спартсменаў-калясачнікаў. А ў валейбол я трапіў дзякуючы дзядулю. Ён сказаў мне: «Выбірай, альбо на варотах будзеш стаяць, альбо ў валейбол гуляць». У дзяцінстве я быў вельмі неспакойны: раніцай хадзіў гуляць у футбол, увечары ў валейбол. Спыніўся ўсё ж на другім, пачаў займацца ім у восем гадоў, атрымліваецца, што ўжо 21 год я ў валейболе.

— Спорт немагчымы без траўмаў, у цябе былі сур'ёзныя праблемы са здароўем?

— У нашым відзе пад ударам спіна, плечы і калені, таму што шмат скачкоў, падзенняў. Цяпер якраз аднаўляюся пасля траўмы калена, спадзяюся, што ўсё наладзіцца.

А наогул свае першыя траўмы я атрымаў у два гады, быў вельмі актыўным дзіцем, браў крэсла, дастаткова сур'ёзнае па вазе, і цягаў яго за сабой па кватэры. Не ведаю, як мне гэта ўдавалася, але ад такіх стараннняў атрымаў дзве пахавыя грыжы. Ногі, дарэчы, таксама ўсе ў шнарах: вельмі любіў дражніць сабак, а яны мяне адпаведна кусалі.

— Чым цяпер звычайна займаешся ў вольны час?

— У мяне няма ніякіх асаблівых захапленняў, нават у вольны ад трэніровак і гульняў час шмат увагі ўдзяляю сваёй фізічнай падрыхтоўцы — фітнес, трэнажорная зала, аднаўленне. Цяпер мне 29, для валейбаліста гэта дастаткова сталы ўзрост, калі ты павінен паказваць добрую гульню, але наогул мне б хацелася пагуляць даўжэй, да 40, напрыклад, таму пастаянна трымаю сябе ў форме.

«Мясцовыя не працуюць, такое адчуванне, што грошы з'яўляюцца ў іх з нараджэння. Таму ўвесь дзень яны могуць проста пракатацца на машыне».

Што датычыцца адпачынку, то, паколькі гуляў сёлета ў Катары і Ізраілі, на мора нават не цягне, хачу проста пабыць дома, на дачы. Мару схадзіць на рыбалку, у грыбы, ужо нават не памятаю, калі апошні раз выбіраўся ў лес.

— Плануецца, што ў маі ты будзеш выступаць за зборную Беларусі ў адборачным турніры да чэмпіянату свету. Гульні за нацыянальную каманду і клуб адрозніваюцца?

— Так, гэта розныя рэчы. Выступаць за сваю краіну заўсёды пачэсна, таму, калі ў маёй дапамозе мае патрэбу зборная, я заўсёды прыязджаю з задавальненнем. Гучыць твой гімн, ты выступаеш пад сваім сцягам. Можна сказаць, што ў клубе гуляеш за грошы, а калі выступаеш за сваю краіну, гэта ідзе ад сэрца.

Дарэчы, акрамя беларускага пашпарта, у мяне ёсць яшчэ і від на жыхарства ў Балгарыі, але думкі змяніць спартыўнае грамадзянства ніколі не было, хоць падобная практыка цяпер распаўсюджана ў свеце. Я стаўлюся да гэтага без асуджэння, але сам хачу выступаць толькі за сваю родную краіну.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.04.2017 г.